І мы там былі...

# «ІНАВАЦЫІ. ІНВЕСТЫЦЫІ. ПЕРСПЕКТЫВЫ»

**У горад на Дзвіне пасля перапынку вярнулася галоўная эканамічная падзея Віцебскай вобласці — Міжнародны эканамічны форум, які прайшоў у культурнай сталіцы адзінаццаты раз. Сёлета ў сінявокую завіталі прадстаўнікі Расійскай Федэрацыі, Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам, Кітая, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Узбекістана, Індыі, Ірана, Пакістана, Ізраіля.**



У рамках эканамічнага форуму было падпісана шэсць рознафарматных дакументаў аб развіцці міжрэгіянальнага партнёрства, а таксама аб узаемадзеянні паміж прадпрыемствамі, установамі адукацыі Віцебшчыны і рэгіёнамі Расіі і Кітая.

Свой эканамічны, турыстычны, адукацыйны і інвестыцыйны патэнцыял на плошчы каля Летняга амфітэатра прадставілі звыш 100 прадпрыемстваў і 10 устаноў адукацыі паўночнага рэгіёна. Кожная са шматлікіх пляцовак прываблівала гасцей і ўдзельнікаў не толькі каляровымі фотазонамі, але і навінкамі вытворчасці, выпушчанымі спецыяльна да галоўнай эканамічнай падзеі вобласці.

Аршанскі мясакансервавы камбінат прывёз на форум варана-вэнджаную тушу індычкі і свіную рульку, якую змаглі паспрабаваць усе ахвотныя. «Пакуль гэтыя прадукты не запушчаны ў вытворчасць, але дэгустацыя паказала, што мяса птушкі карыстаецца вялікім попытам, тым больш што яно вырашчана таксама на філіялах нашага прадпрыемства. На выстаўцы-дэгустацыі мы прапанавалі навінкі — кансерву «Народную» з тушанай ялавічыны, каўбасу сыравяленую першага сорту «Шунджук». У найбліжэйшы час Аршанскі мясакансервавы камбінат парадуе пакупнікоў зноў: у распрацоўцы знаходзяцца тры віды дзіцячага харчавання ў кансервах», — адзначылі прадстаўнікі АМКК.

ААТ «Віцебскхлебпрам» прывёз на выстаўку два эксклюзіўныя віды хлеба, якія ў першы дзень форуму адправіліся на вітрыны толькі фірменных крам. «Жытні дар» і «Жытнія традыцыі» — новы хлеб без дабаўлення цукру і пшанічнай мукі — стаў адказам прадпрыемства на павышаны запыт пакупнікоў. Такія хлебабулачныя вырабы лічацца дыетычнымі і карыснымі, выраблёнымі па складанай 4-стадыйнай тэхналогіі. «Смачна, незвычайна. І колер такі прыемны, саладавы», — адзначае адзін са шматлікіх наведвальнікаў пляцоўкі «Віцебскхлебпрама».

Турыстычны патэнцыял Віцебскай вобласці быў прадстаўлены аграсядзібамі і комплексамі. Сярод іх — «Чырвоны Бор» Верхнядзвінскага раёна, які размяшчаецца на беразе возера Белае. Тут знойдзецца справа па душы аматарам палявання і рыбалоўства, прыхільнікам актыўнага адпачынку. Турыстаў з усіх краін свету запрашаюць наведаць экскурсію па пчальніку і паўдзельнічаць у майстар-класе па варцы самагонкі.

Сярод прадстаўнікоў устаноў адукацыі вобласці былі студэнты Віцебскага дзяржаўнага тэхнічнага каледжа. Будучыя будаўнікі на пляцоўцы форуму ў рэжыме рэальнага часу прэзентавалі свой праект-пераможцу абласнога этапу конкурсу прафесійнага майстэрства «ProfSkills». Побач праходзілі майстар-класы па абліцоўванні пліткай і малярна-дэкаратыўнай рабоце.

На XI Міжнародным эканамічным форуме «Інавацыі. Інвестыцыі. Перспектывы» рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Белмытсэрвіс» прадставіла развіццё транспартна-лагістычнай інфраструктуры Віцебскай вобласці (транспартна-лагістычны цэнтр «Віцебск-Белмытсэрвіс»), развіццё інфраструктуры па лініі найбуйнейшых транспартна-лагістычных калідораў, якая забяспечвае бесперашкоднае праходжанне таварна-транспартнага патоку праз тэрыторыю краіны. На пляцоўцы лагістаў дэманстравалася арганізацыя перачэпкі/перагрузкі, якую ў комплексе з паслугамі па афармленні транзітных дэкларацый, даванні гарантый, арганізацыі перавозкі па тэрыторыі ЕАЭС і іншымі «Белмытсэрвіс» аказвае каля границы з Еўрапейскім саюзам. Гасцей і ўдзельнікаў форуму азнаёмілі з уласнымі IT-распрацоўкамі кампаніі, якія могуць быць выкарыстаны на тэрыторыі краін ЕАЭС для аўтаматызацыі працэсаў кіравання лагістыкай, для маніторынгу стану і месцазнаходжання транзітных грузаў, а таксама з праграмным прадуктам для арганізацыі работы зон чакання транспартных сродкаў у пунктах пропуску на граніцы.

«Белмытсэрвіс» уже пачаў рэалізацыю праекта па будаўніцтве транспартна-лагістычнага цэнтра класа А ў Віцебскім раёне. ТЛЦ размесціцца ўздоўж асноўных транспартных калідораў, паблізу аэрапорта ў Віцебску, што дасць магчымасць аказваць усе віды лагістычных паслуг на сучасным узроўні. Ён будзе ўяўляць сабой комплекс аб'ектаў, на складскім комплексе плануецца арганізаваць склад часовага захоўвання, мытны склад і склад агульнага карыстання. Таксама на дадзеным тэрмінале плануецца арганізацыя пункта мытнага афармлення грузаў.

На стадыі падрыхтоўкі знаходзіцца яшчэ адзін праект па будаўніцтве транспартна-лагістычнага цэнтра паблізу рэспубліканскага пункта мытнага афармлення «Грыгароўшчына», таксама ў планах прадпрыемства ўзвядзенне тэрмінала ў Браслаўскім раёне.

«Транспартна-лагістычны патэнцыял Віцебскай вобласці ў частцы апрацоўкі экспартных і транзітных грузаў, якія рухаюцца ў напрамках Усход — Захад і Поўнач — Поўдзень, вельмі вялікі, і ён на сённяшні раскрыты не ў поўнай меры. Таму ў найбліжэйшай перспектыве нашым прадпрыемствам пры падтрымцы Віцебскага аблвыканкама будзе рэалізаваны шэраг інвестыцыйных праектаў у рэгіёне», — адзначыў **генеральны дырэктар РУП «Белмытсэрвіс» Вадзім БАБАРЫКІН.**

На адкрыцці форуму **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** падкрэсліў, што ініцыятывы і мерапрыемствы, прапанаваныя на форуме, дапамогуць інвестарам вызначыць, якія з іх маюць больш патэнцыял. «Мы арыентуемся на стварэнне прынцыпова новых вытворчасцяў, глыбокую мадэрнізацыю і тэхнічнае пераўзбраенне дзеючых прадпрыемстваў, стварэнне высокапрадукцыйных рабочых месцаў ва ўсіх галінах эканомікі. У кожным раёне нашай вобласці ёсць магчымасці для сумеснай дзейнасці. Прадпрыемствы паўночнага рэгіёна могуць выступаць надзейнымі партнёрамі ў рэалізацыі самых перадавых інвестыцыйных ідэй», — падкрэсліў кіраўнік вобласці.

Ён уручыў Ганаровыя граматы абласнога выканаўчага камітэта прадпрыемствам і арганізацыям за высокія дасягненні ў развіцці галін эканомікі Віцебскай вобласці і прыцягненне інвестыцый, а таксама маладым вучоным.

На выніковым мерапрыемстве ўручылі ўзнагароды 19 арганізацыям Віцебскай вобласці, якія сталі пераможцамі конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» 2022 года. Звання лаўрэатаў гэтага конкурсу ўдастоены 34 тавары прадпрыемстваў паўночнага рэгіёна. Таксама ўзнагароды атрымалі прадстаўнікі моладзі за поспехі ў вучобе і ўдзел у розных конкурсах прафмайстэрства і 8 прадпрыемстваў Віцебшчыны, якія сталі па выніках работы мінулага года лаўрэатамі прэміі аблвыканкама за дасягненні ў галіне якасці.

У наступным годзе арганізатары форуму плануюць арганізаваць пляцоўкі для прэзентацыі не толькі прадпрыемстваў вобласці, але і замежных партнёраў. «Форум прайшоў вельмі пазітыўна, абстаноўка на прэзентацыйнай пляцоўцы адкрытая, дыялогавая. Было шмат удзельнікаў секцый. Амаль 70 прадпрыемстваў падключыліся да форуму ў рэжыме анлайн. Цесна абмяркоўваліся пытанні кааперацыі і інтэграцыі. Ужо ёсць пэўныя намеры па супрацоўніцтве ў частцы паставак харчовай, ільнопрадукцыі, дамоўленасці па пастаўках віцебскіх пад'ёмнікаў. На розных пляцоўках людзі размаўлялі, абменьваліся кантактамі. І нават цяпер, у другі дзень форуму, відаць водгук — прадстаўнікі расійскіх рэгіёнаў тэлефануюць, пытаюцца аб пэўных прадпрыемствах. На дэманстрацыйную пляцоўку прыходзіць шмат моладзі знаёміцца з установамі адукацыі, якія тут прадстаўлены. У цэлым госці і ўдзельнікі станоўча ацэньваюць арганізацыю такіх сумесных лакацый, дзе суседнічаюць прадпрыемствы і ВНУ, ССНУ вобласці. Усе цікавяцца, дзе рыхтуюць кадры для тых ці іншых прадпрыемстваў у рэгіёне, таму такі сімбіёз дае станоўчыя вынікі», — заключыла **намеснік старшыні аблвыканкама Анжаліка НІКІЦІНА.**

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Фота прэс-службы «Белмытсэрвіс».**

# У Янліне адкрыўся форум ШАС

**У кітайскім Янліне, што ў правінцыі Шэньсі, адкрыўся форум Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС). У маштабным мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі краін — членаў ШАС, назіральнікаў, а таксама партнёраў па дыялогу. Асвятляюць работу глабальнага форуму кітайскія, а таксама замежныя СМІ з больш чым 20 краін. Сярод іх — карэспандэнт «Звязды».**

Тэма форуму ў Янліне — скарачэнне беднасці і ўстойлівае развіццё. Як адзначаў на цырымоніі адкрыцця генеральны сакратар Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Чжан Мін, беднасць — глабальная праблема, якая актуальная для многіх краін. Кітай мае ўнікальны вопыт у барацьбе з беднасцю. У КНР цягам апошніх гадоў адбыліся проста каласальныя зрухі ў гэтым кірунку. Як падкрэсліў Чжан Мін, Кітай гатовы ахвотна дзяліцца ўнікальным вопытам з дзяржавамі «шанхайскай сям'і». У сённяшніх няпростых умовах краінам ШАС надзвычай важна развіваць супрацоўніцтва і ўмацоўваць узаемадзеянне па шэрагу стратэгічных кірункаў.

Месца правядзення глабальнага форуму абрана адмыслова. Як адзначыла намеснік старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў, старшыня Кітайскага камітэта па добрасуседстве, сяброўстве і супрацоўніцтве Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Юэ Юэ, у правінцыі Шэньсі апошнім часам былі створаны належныя ўмовы для павышэння дабрабыту людзей. Усё залежыць ад вынікаў эканамічнага развіцця. Напрыклад, сёлета ў першым квартале аб'ём валавога рэгіянальнага прадукту правінцыі ў параўнанні з такім жа часам летась павялічыўся на 5,3 працэнта. Даход на душу насельніцтва гарадскіх і сельскіх жыхароў узрос адпаведна на 5,1 і 7 працэнтаў.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ,**

*Янлін.*

Надвор'е

# МАКСІМАЛЬНЫ КЛАС ПАЖАРАНЕБЯСПЕЧНАСЦІ, А ДАЖДЖОЎ УСЁ НЯМА

## Бліжэй да выхадных да нас зацягне порцыю халаднаватага паветра — у нядзелю магчымыя начныя замаразкі

**У апошнюю дэкаду мая пачаў масава квітнець бэз. У паветры запахла летам. Вось толькі істотных ападкаў у Беларусі па-ранейшаму чакаць не варта. Невялікія кароткачасовыя дажджы прагназуюцца толькі днём у аўторак у асобных раёнах краіны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Не варта разлічваць на дажджы, здольныя папоўніць дэфіцыт вільгаці ў глебе, і ў пачатку першага летняга месяца. Ападкі будуць насіць кароткачасовы і лакальны характар, месцамі іх наогул не будзе. У сувязі з гэтым айчынныя сіноптыкі адзначаюць, што з 30 мая да 1 чэрвеня на большай частцы Гомельскай вобласці, а 31 мая і 1 чэрвеня месцамі і па Мінскай вобласці чакаецца надзвычайная пажарная небяспека (5-ы клас), таму неабходна быць асцярожнымі з агнём на прыродзе.

Тэмпературны фон на гэтым тыдні будзе неўраўнаважаны: да 2 чэрвеня ў краіне будзе ўтрымлівацца ўмерана цёплае надвор'е, а ў пятніцу ў нашу краіну пачне паступаць халодная паветраная маса. Першымі гэта адчуюць жыхары паўночна-заходніх раёнаў, а ўжо ў выхадныя ў халодным паветры апынецца большасць рэгіёнаў краіны.

У аўторак максімальная тэмпература паветра ўдзень падымецца да плюс 19—25 градусаў. Наступнай ноччу чакаецца 2—8 цяпла, па паўднёвым усходзе плюс 11 градусаў. У сераду тэмпература будзе ў межах 18—24 градусаў.

У першы дзень чэрвеня тэмпература паветра ўначы складзе ад 3 да 10 градусаў, удзень — 20—27 цяпла.

І толькі ў пятніцу месцамі па Беларусі пройдуць адносна «важкія», але кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература ноччу складзе ад 6 да 13 цяпла, днём — ад плюс 15 градусаў па паўночным захадзе да 27 па паўднёвым усходзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у найбліжэйшыя выхадныя ў Беларусі чакаецца не па сезоне халоднае надвор'е. У начныя гадзіны тэмпература паветра па краіне знізіцца ад 8 да 1 градуса, па паўднёвым усходзе — 10 градусаў цяпла. А ў нядзелю пры ўмове працяглых праясненняў зноў вернуцца пагроза замаразкаў — тэмпература складзе ад 0 градусаў да 2 марозу.

У суботу днём чакаецца надвор'е пераважна без ападкаў, месцамі па паўднёвым усходзе магчымыя кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра будзе вар'іравацца ад 13 да 20 цяпла, у паўднёвых раёнах можа дасягнуць плюс 22 градусаў.

У нядзелю таксама будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра днём прагназуецца ад 15 да 21 цяпла, па поўдні дасягне 23 градусаў з плюсам.

**Сяргей КУРКАЧ.**